ДУК «Бібліятэчная сетка Хоцімскага раёна»
Дзіцячая бібліятэка-філіял

# Любі, шануй, ведай родную мову!

Віртуальная выстава

**Мова… Наша родная мова…** Колькі мілагучнасці, таемнасці ў гэтым слове. Залатыя лісцікі на дрэвах, кожная птушка, кожная кветка і, канешне чалавек – усе маюць сваю мову. “Самы найвялікшы і бясспрэчны закон жыцця – гэта людская мова, праз якую чалавек стаў вышэй за ўсіх істот пад сонцам”, - пісаў знакаміты Янка Купала. Сапраўды, чалавечую мову нельга параўнаць з мовай птушак, жывёл, раслін. Яна з’яўляецца больш прыгожай, мілагучнай, дзякуючы ёй людзі размаўляюць, вучацца, дасягаюць сваёй мэты, але нашу родную мову трэба аберагаць, трэба не саромецца яе.  У былыя часы людзі якім трэба было адрачыся ад роднай мовы, ад Радзімы вельмі пакутавалі.

**“Наша мова – гэта народны скарб.** Яго нельга не шанаваць, як нельга не шанаваць родны народ”, - з хваляваннем гаварыў Іван Мележ. Адзін вельмі знакаміты чалавек гаварыў: “Мова ласкавая і мілагучная, як песня”. Таму мы павінны “спяваць”, гаварыць на сваёй мове, вучыць іншых размаўляць на ёй. “Чалавек – гэта цэлы свет”, - сказаў Кузьма Чорны. Значыць, чалавек можа ўсё: можа ўзбагаціць нашу мову, можа аберагаць яе, змагацца за яе, каб не страціць зусім. “Хто забыў сваіх продкаў – сябе згубіў, а хто забыў сваю мову – усё згубіў”.

**Мова – гэта тое, без чаго не можа жыць ніводны чалавек.** Любі сваю мову за тое, што яна прыгожая і мілагучная, што яна дае людзям тое, без чаго нельга жыць. Любі сваю мову за тое, што яна самая найлепшая за ўсе іншыя мовы.

**Мову неабходна аберагаць і шанаваць.** Мова і мы – гэта адзінае на свеце. Так павінен думаць кожны беларус. Любоў да яе павінна праяўляцца ў кожным нашым дзеянні і ўчынку.  Мова – гэта наша спадчына.

# Ад знака да літары

*Ідзі, народзе ўваскрэслы,*
*Да светлай шчырасці ідзі,*
*З пісьменствам,*
*Гэтай сілай новай,*
*Шчаслівы лёс сабе знайдзі!*
*Смялей! Народнасць не загіне,*
*Дзе з цемры светач паўстае!*

*С. Міхайлоўскі*




**Асветнікі зямлі беларускай : X — пачатак XX ст. : энцыклапедычны даведнік / рэдкалегія: Г. П. Пашкоў [і інш.] ; мастак У. М. Жук. — 2-е выданне — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2006. — 496 с. : іл.**

У кнізе змешчаны матэрыялы пра жыццёвы і творчы шлях каля 750 прадстаўнікоў філасофскай і грамадскай думкі Беларусі ад старажытных часоў да пачатку 20 стагоддзя. Сярод іх дзяржаўныя, грамадска-палітычныя і рэлігійныя дзеячы, філосафы і педагогі, пісьменнікі і мастакі, кампазітары і музыканты, выдаўцы і бібліятэкары, прыродазнаўцы, падарожнікі і краязнаўцы, удзельнікі нацыянальна-вызваленчага і рэвалюцыйнага руху, незалежна ад нацыянальнай прыналежнасці, грамадскай пазіцыі і светапогляду. Выданне разлічана на навукоўцаў, студэнтаў і навучэнцаў, усіх тых, хто цікавіцца пытаннямі гісторыі, развіцця грамадскай думкі і асветы на Беларусі




**Бутрамееў, У. Вялікія і славутыя людзі зямлі беларускай : для малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту / У. Бутрамееў ; мастак М. Рыжы. — 4-е выданне — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2005. — 128 с. : іл.**

Кніга У. Бутрамеева знаёміць дзяцей з выдатнымі гістарычнымі асобамі беларускай зямлі. У займальнай папулярнай форме выкладае старажытную гісторыю Беларусі, вучыць любіць свой край. Будзе цікавай для ўсіх, хто жадае ведаць гісторыю Беларусі.

Кніга багата ілюстравана.




**Мяснікоў А. Ф. Сто асоб беларускай гісторыі : гістарычныя партрэты / Анатоль Мяснікоў. — 2-е выданне, дапрацаванае. — Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2009. — 344 с.**

У гісторыі кожнай краіны самы адметны і значны след пакідаюць, як вядома, яе вялікія і знакамітыя асобы: уладары, асветнікі, гісторыкі, дойліды, пісьменнікі, мастакі, музыкі ды іншыя выбітныя постаці. "Сто асоб беларускай гісторыі" – першая кніга, дзе пад адной вокладкай аўтар сабраў найбольш вядомыя біяграфічныя партрэты вось такіх неардынарных людзей нашай Бацькаўшчыны. На працягу стагоддзяў па-рознаму адносіліся да іх улады і грамадства. Адных славілі, узносілі ў свой час, іншых – ганьбілі, знеслаўлялі, каралі... Але самы правідны суддзя – гэта час, які сёння вынес верны прысуд героям кнігі: пра іх маюць права ведаць усе.




**Францыск Скарына на мовах народаў свету / укладальнік Алесь Карлюкевіч ; прадмова Алеся Сушы. — Мінск : Звязда, 2014. — 136 с. : іл.**

У выданні ўпершыню прадстаўлены пераклады прадмовы Францыска Скарыны да кнігі "Юдзіф" на 64 мовы народаў свету: тэксты прадстаўлены на рускай, англійскай, балгарскай, італьянскай, кітайскай, польскай, французскай, японскай і іншых мовах выданняў.64 дарогі да чытача, 64 сцежкі асэнсавання слоў беларускага першадрукара, выкладзеных душой і сэрцам амаль 5 стагоддзяў таму.

Вылучаецца кніга і багатым ілюстрацыйным матэрыялам: старонкі выдання ўпрыгожаны гравюрамі Францыска Скарыны, а напрыканцы кнігі – выявы тытульных лістоў скарынаўскіх выданняў.

# Ключ да ўсіх навук

*Граматычны лад нашай мовы настолькі дасканалы, што дае магчымасць пабудаваць любую фразу, выказаць любую думку.*

*К. Крапіва*




**Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. — Мінск : Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь, 2008. — 144 с.**

Збор правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі, зацверджаных Законам Рэспублікі Беларусь ад 23 ліпеня 2008 года. Адрасуецца самаму шырокаму колу карыстальнікаў.




**Беларускі арфаграфічны слоўнік / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы ; укладальнікі : Л. П. Кунцэвіч, І. У. Кандрацэня ; пад рэдакцыяй А. А. Лукашанца. — 2-е выданне, — Мінск : Беларуская навука, 2010. — 695 с.**

Новы беларускі арфаграфічны слоўнік грунтуецца на правілах, якія ўводзяцца ў дзеянне Законам Рэспублікі Беларусь "Аб Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі", прынятым у 2008 г. Аснову амаль 700-старонкавага слоўніка складаюць найбольш пашыраная агульнаўжывальная лексіка, а таксама словы, якія могуць выклікаць цяжкасці пры напісанні. Слоўнік мае нарматыўны характар і разлічаны на вучняў сярэдніх школ, навучэнцаў сярэдніх спецыяльных устаноў, абітурыентаў, настаўнікаў беларускай мовы, выкладчыкаў і студэнтаў, а таксама ўсіх, хто карыстаецца пісьмовай беларускай мовай.




**Слоўнік беларускай мовы / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы ; укладальнік Н. П. Еўсіевіч і [інш.] ; навуковы рэдактар А. А. Лукашанец, В. П. Русак. — Мінск : Беларуская навука, 2012. — 916 с.**

Найбольш поўны акадэмічны слоўнік беларускай мовы, падрыхтаваны з улікам змен, што адбыліся ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі». У аснову рэестра слоўніка, які ўключае каля 150 тыс. слоў, пакладзены рэестр «Слоўніка беларускай мовы» 1987 года выдання, значна дапоўнены лексікай, што ўвайшла ва ўжытак у апошнія дзесяцігоддзі, а таксама лексікай, якая можа выклікаць цяжкасці пры напісанні па новых правілах.




**Шкраба, І. Р. Слоўнік беларускай безэквівалентнай лексікі (у рускамоўным дачыненні) / І. Р. Шкраба. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя Імя П. Броўкі, 2008. — 320 с.**

У Слоўніку раскрываецца значэнне слоў, якія належаць да безэквівалентнай лексікі беларускай мовы з пункту гледжання яе праекцыі на рускую. Слоўнік прызначаны найперш для ўсіх тых, хто працуе са словам прафесійна — выкладчыкаў, студэнтаў-філолагаў, перакладчыкаў, журналістаў, рэдактараў. Ён таксама можа стаць карысным даведнікам для тых, хто пачынае вывучаць беларускую мову і пашырае свой лексікон. Безэквівалентная лексіка цікавая і ў пазнавальным плане, бо яна адлюстроўвае ўплыў акалічнасцей жыцця і дзейнасці чалавека на фарміраванне нацыянальнай сістэмы значэнняў мовы.




**Клышка, М. К. Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў / М. І. Клышка. — Мінск : Беларуская Навука, 2005. — 292 с.**

«Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў» беларускай мовы – асноўнае ў рэспубліцы выданне такога роду. Тут сабрана больш за 11 тысяч слоў, як асноўнага слоўнікавага саставу, так і матэрыял спецыфічных пластоў (размоўна-бытавая лексіка, фразеалагізмы, устойлівыя злучэнні) беларускай мовы. Лексічны матэрыял ілюструецца прыкладамі з мастацкай літаратуры, твораў фальклору, перыядычных і навукова - даведачных выданняў. Слоўнік ставіць сваёй мэтай задаволіць запатрабаванні моўнай практыкі: кола чытачоў, якія добра валодаюць беларускай мовай. Разам з тым ён з'явіцца каштоўным дапаможнікам для тых, хто мае намер вывучыць беларускую мову, авалодаць яе багаццем.

# Слаўнае багацце мовы

*Адкрываю, як свет, нанова*
*Беларускае роднае слова*

*А. Канапелька*




**Завальнюк, У. М. Слоўнік сучаснай беларускай мовы / У. М. Завальнюк, М. Р. Прыгодзіч, В. К. Раманцэвіч ; пад агульнай рэдакцыяй М. Р. Прыгодзіча, У. М. Завальнюка. — Мінск : Народная асвета, 2009. — 399 с.**

У выданні прадстаўлена лексіка сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

Слоўнік прызначаны для школьнікаў, студэнтаў, настаўнікаў і ўсіх, хто дбае пра чысціню і выразнасць роднай мовы.




**Пазнякоў, М. П. Слоўнік эпітэтаў беларускай літаратурнай мовы : у 2 т. / М. Пазнякоў. — Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2012. — 1 т.**

У слоўніку сабраны і пададзены па семантычных групах эпітэты да амаль 450 найбольш ужывальных назоўнікаў беларускай мовы. Лексічны матэрыял ілюструецца прыкладамі з мастацкай літаратуры, фальклору, перыядычных і навукова-даведачных выданняў.

Праца разлічана на пісьменнікаў, перакладчыкаў, рэдактараў, журналістаў, работнікаў радыё, тэлебачання і друку, выкладчыкаў, студэнтаў, вучняў сярэдніх школ, а таксама ўсіх, хто цікавіцца беларускай мовай.




**Іўчанка, В. І. Беларуская арфаграфія : апавяданні і гісторыі / В. І. Іўчанка. — Мінск : Пачатковая школа, 2010. — 304 с. — іл.**

У навукова-папулярным выкладзе падаюцца “Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі”, зацверджаныя Законам Рэспублікі Беларусьад 23 ліпеня 2008 г. Апавяданні суправаджаюцца гістарычнымі каментарыямі і займальным матэрыялам. Новая рэдакцыя правапісу супастаўляецца з “Правіламі” (1959). Цяжкія правапісныя выпадкі разглядаюцца на прыкладах канкрэтных лінгвістычных сітуацый. Кніга прызначаецца для настаўнікаў, журналістаў і рэдактараў, вучняў і студэнтаў.




**Лепешаў, І. Я. Слоўнік фразеалагізмаў : у 2 т. / І. Я. Лепешаў. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2008. — 2 т.**

У слоўніку даецца апісанне каля 7 тысяч фразеалагізмаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Кожны з іх атрымлівае граматычную, стылістычную і семантычную характарыстыку. У апошнюю ўваходзяць тлумачэнне фразеалагізма, адлюстраванне яго мнагазначнасці, варыянтнасці, сінанімічнай і антанімічнай сувязей. Слоўнік прызначаны для спецыялістаў-мовазнаўцаў, пісьменнікаў, журналістаў, настаўнікаў, студэнтаў, усіх, хто цікавіцца беларускай мовай.

# Вялікі дар нашчадкам

*Быць Беларусам –*
*Гэта значыць*
*Свайго ні гуку не забыць,*
*Усё чужое перайначыць,*
*Каб Беларусі вечнай быць!*

*Быць Беларусам –*
*Гэта значыць*
*За родны край згараць на дым,*
*Па-беларуску чуць і бачыць*
*На гэтым свеце і на тым.*

*Р. Барадулін*




**Сем цудаў Беларусі : для малодшага і сярэдняга ўзросту / Уладзімір Ягоўдзік ; мастак П. Татарнікаў. — Мінск : Кавалер Паблішэрс, 1999. — 30, [1] с.**

Гэта кніга, створаная на мяжы XX і XXI стагоддзяў, адкрывае серыю літаратурна-мастацкіх выданняў з аднайменнай назвай «Сем цудаў Беларусі». У наступных кнігах серыі - легенды пра чароўныя пацеркі - рэкі і азеры, апавяданні аб легендарных беларускіх гарадах, рэдкіх і зніклых птушках і жывёлах нашага краю, а таксама шмат іншага цікавага і пазнавальнага.




**Славутыя родам сваім : для малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту / Анатоль Бутэвіч ; ілюстрацыі П. Татарнікава. — Мінск : Мінская фабрыка каляровага друку, 2006. — 30, [1] с. — (Сем цудаў Беларусі).**

Чарговая кніга з серыі “Сем цудаў Беларусі” прысвечана лёсам толькі некаторых прадстаўнікоў даўніх і знакамітых родаў, што жылі некалі на беларускай зямлі. Многія праявілі сябе мецэнатамі, падтрымлівалі развіццё навукі, культуры і мастацтва, спрыялі пашырэнню адукацыі сярод простага люду. Напамінкам пра іхнюю магутнасць і дасведчанасць засталіся крэпасці, замкі, палацы, цэрквы, касцёлы, іншыя выдатныя збудаванні, што дагэтуль захаваліся на нашай зямлі. А яшчэ ў іхніх дварах і маёнтках былі сабраны багатыя бібліятэкі, дзе захоўваліся не толькі каштоўныя рукапісныя і друкаваныя кнігі, але і шматлікія дакументы па гісторыі, унікальныя архівы.




**Адвечны покліч Радзімы : для малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту / Анатоль Бутэвіч ; ілюстрацыі П. Татарнікава. — Мінск : Мінская фабрыка каляровага друку, 2004. — 27, [4] с. — (Сем цудаў Беларусі).**

Цягам пяці стагоддзяў узвышае людскі дух цудатворны Мінскі абраз Божай Маці. Прамудрасцю Боскай асвятляе беларускі шлях Полацкая Сафійка. Згублены ў часе крыж Льва Сапегі праменіцца не толькі святасцю, а і душэўнай шчырасцю і шчодрасцю яго стваральніка і фундатара. Дагэтуль уражвае пранiклівай мудрасцю і ўсебаковай дасведчанасцю беларускі паэт-лацініст Мікола Гусоўскі, аўтар выдатнай паэмы-хваласпеву ў гонар Вітаўта Вялікага “Песня пра зубра”. Пра гэтыя залацінкі-цуды роднай Беларусі ідзе расказ у выданні.




**У гасцях у вечнасці : для малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту / Анатоль Бутэвіч ; ілюстрацыі П. Татарнікава. — Мінск : ВТАА "Кавалер Паблішэрс ", 2001. — 27, [4] с. — (Сем цудаў Беларусі).**

Як вядома, на пачатку было Слова. І Слова было ў Бога. І Богам было Слова. У Слове пульсавала жыццё, і Слова з'яўлялася святлом для людзей. Пасля словы пачалі складвацца ў сказы, сказы - у рознага кшталту аповяды. І паплыло, забурліла, заштарміла слоўнае мора, усё больш адыходзячы ад сваёй першаасновы. А ў моры гэтым пачало тануць тое першаснае і глыбокае, адзінае і магутнае Слова, якое было на пачатку.




**Перуновага племені дзеці : для малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту / Анатоль Бутэвіч ; [ілюстрацыі П. Ю. Татарнікава]. — Мінск : Мінская фабрыка каляровага друку, 2008. — 27, [4] с. — (Сем цудаў Беларусі).**

Пярун. Ляля. Лада. Род. Купалле. Зюзя. Жыжа. Сварог. Жыцень... Не адно стагоддзе з імі жылі, на іхнім прыкладзе вучыліся быць добрымі, шанаваць бацькоў і старэйшых людзей. Дахрысціянская вера беларусаў была прасякнута культам дабра і культам продкаў. Гэтыя рысы захаваліся і пасля прыняцця хрысціянства.

Даўнія міфічныя героі нібыта клічуць зазірнуць за намітку гісторыі, за яе небакрай, каб даведацца: а што ж было там і тады, дзе і калі не было нас? Бо веданне сваёй гісторыі — гэта добры шанц не знікнуць у невядомасці, не растварыцца ў часам багацейшай і больш даследаванай гісторыі іншых народаў. Гэта выдатная магчымасць адчуць повязь часу, еднасць лёсу, адказнасць за тое, што было да нас, і за тое, што застанецца пасля нас.

# Чарадзеі роднага слова

*Нізашто не скажаш*
*Лепш не выкажаш радасці, болю*
*У адзіным, адным толькі слове,*
*Як на мове сваёй, роднай мове!*

*А. Дзяржынскі*




**Востраў русалак : легенды, паданні / укладальнік У. К. Казько ; мастак Т. П. Беразенская. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2009. — 135 с. : іл. — (Беларускі фальклор).**

Адну з найважнейшых старонак беларускага народнага эпасу складаюць легенды – невялікія фальклорныя або літаратурныя апавяданні, у аснове якіх ляжаць аповеды пра нейкую незвычайную падзею або геранічны ўчынак выдатнага чалавека. У гэтым зборніку уключаны малавядомыя шырокаму чытачу творы, дзе падаюцца старажытныя міфалагічныя ўяўленні пра паходжанне Сусвету, Зямлі, чалавека, раслін, жывел, дзе чалавек рабіў спробы разабрацца ў прычынах розных захворванняў, выказваў адносіны простых людзей да Бога, святых і іх антыподаў – чарцей, ведзьмакоў.




**Загадкі / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; складальнікі : М. Я. Грынблат, А. І. Гурскі ; рэдактар тома : А. С. Фядосік. — 2-е выданне, выпраўленае і дапрацаванае — Мінск : Беларуская Навука, 2004. — 363 с. — (Беларуская народная творчасць).**

Том «Загадкі» ўпершыню выйшаў у 1972 г.

Загадкі належаць да тых жанраў беларускага фальклору, у якіх найбольш ярка праявілася мудрасць народа, яго тонкая жыццёвая назіральнасць, любоў да паэзіі, трапнага слова.

Кніга з'яўляецца навуковым выданнем беларускіх народных загадак, сабраных з максімальнай паўнатой. Том забяспечаны ўступным артыкулам, навуковым каментарыем і паказальнікам збіральнікаў.




**Пераначуеш — больш пачуеш : прыказкі і прымаўкі для дарослых і школьнікаў, для разумных і шкоднікаў : для сярэдняга і старшага школьнага ўзросту. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2002. — 254 с. : іл.**

Рупліва адабраныя, прафесійна апрацаваныя беларускія прыказкі і прымаўкі даюць цэласнае ўяўленне пра глыбіню і значнасць мовы беларускага народа.

Выданне разлічана на шырокае кола чытачоў.




**Лучынка : сінанімічныя ўзоры, моўны этыкет, вершы, проза, замовы, крылатыя выслоўі, смяшынкі, беларускі народны гумар / укладальнікі : З. І. Кустава, В. А. Салаўёва ; мастак М. В. Пракаповіч. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2013. — 240 с.**

Казачнае ўвасабленне жывога агню школкі-вучэльні «Лучынка» асвеціць далейшы шлях усім, хто далучыцца да вывучэння і больш глыбокага ўспрымання роднай мовы праз слова, словазлучэнне, сказ і тэкст. Чытачы пазнаёмяцца з моўным этыкетам, культурай мовы і паводзін на аснове творчага падыходу да літаратурнага матэрыялу, што спрыяе больш глыбокаму засваенню класічных і сучасных твораў беларускіх пісьменнікаў. У кнізе ёсць раздзел для аматараў паэтычных радкоў сусветна вядомых паэтаў у перакладзе на беларускую мову. Кніга вучыць спазнаваць і разумець залацінкі народнай мудрасці, карыстацца крылатымі выслоўямі, умець разважаць і жартаваць.




**Нам засталася спадчына : нарысы, вершы : для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту / укладальнікі : М. Маляўка, Т. Тарасава, Уладзімір Мазго ; мастак Лізавета Пастушэнка. — Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2011. — 208 с. : іл.**

Гэта — незвычайная кніга. Яе дораць вам аўтары «Вясёлкі» — пісьменнікі і журналісты. Творы гэтага своеасаблівага падручніка па гісторыі роднай Беларусі друкаваліся на старонках вашага любімага часопіса пад рубрыкай «Наша спадчына». Хочацца верыць, што такія кнігі будуць выдавацца і далей, бо гістарычная спадчына нашай Бацькаўшчыны багатая і цікавая.